“Я ХАЧУ ДАВЕДАЦЦА АД ВАС, ШТО ЧУТНО З БУКВАРОМ… ЦІ Ў НАС БУДЗЕ ФАНЭТЫКА НАША БЕЛАРУСКАЯ…”

Галоўная жанчына ў гісторыі Беларусі XX стагоддзя



Карына ГІНЬКО
Фота аўтара і з адкрытых інтэрнэт-крыніц

2026 год аб’яўлены Годам беларускай жанчыны ў нашай краіне. На маю думку, вельмі сімвалічна. Чаму? Шмат жанчын, якія стаялі ў вытокаў беларускай дзяржаўнасці, сёлета маглі б адзначыць свае юбілеі. Напрыклад, славутая дзяячка – Алаіза Пашкевіч. Больш мы яе, канешне, ведаем пад псеўданімам Цётка. Ёй спаўняецца 150 год, а таксама 110 год з дня смерці. Летась яе імя было ўключана ў пантэон нацыянальных герояў Беларусі. Чаму? Давайце пройдземся дарогамі жыцця гераіні, каб адказаць на пытанне!

КРОК №1

Дзяўчынка нарадзілася на тэрыторыі сённяшняга Шчучынскага раёна. У сям’і было 12 дзяцей. На жаль, маці рана сышла з жыцця. Бацька не мог даць рады, таму Алаізу адправіў на выхаванне да дзядулі і бабулі. Жанчына выхоўвала ўнучку так, каб тая ў будучым магла стаць добрай гаспадыняй, цудоўнай жонкай і клапатлівай маткай. Але малой было нецікава, бо сэрца ляжала да адукацыі. Адзінае, што падабалася ў хатніх справах, – смажыць дранікі. Хоць да іх як да стравы ставілася спакойна, але любіла есці кілбасы!



КРОК №2

Прага да вучобы дапамагла паступіць у прыватнае вучылішча ў Вільні. Ёй як старанной вучыніцы нават была прызначана стыпендыя. На жаль, грошай не хапала. Дзяўчынцы прыходзілася галадаць. Аднойчы дайшло да таго, што на занятках страціла прытомнасць. Аднакласніца перапужалася, таму расказала пра здарэнне сваёй сям'і. Тады маці прапанавала дачцэ наступнае: "Я буду даваць табе булкі на дваіх, а ты кладзі іх ў яе столік, калі яе няма ў класе". Спачатку Алаіза злавалася на дапамогу. Нават адмаўлялася прымаць, але настаўніца з часам пераканала. Дзяўчынку падкормлівалі да канца вучобы.

КРОК №3

Алаіза Пашкевіч заўсёды прагнула дасягнуць вялікіх мэтаў. Трэба сказаць, яна з малых гадоў лічыла сябе беларускай. Калі трапіла ў Пецярбург на вучобу, яе прага да нашых культуры і мовы разгарнулася на поўную моц. Прычына ў тым, што сюды прыязджала шмат беларусаў таксама на вучобу. Падчас адукацыі яны стваралі аб'яднанні для папулярызацыі беларускасці. У адно з іх і патрапіла дзяўчына. Называлася яно "Круг беларускай народнай прасветы і культуры". Займалася друкаваннем беларускамоўных выданняў. Распаўсюджванне павінна было адбывацца, калі студэнты адпраўляліся на вакацыі на радзіму.



КРОК №4

У 1906 годзе ў пецярбургскім выдавецтве "Загляне сонца і ў наша ваконца" быў выпушчаны "Беларускі лемэнтар або першая навука чытання". Інакш кажучы, першы беларускі буквар. Адным з яго аўтараў стала Алаіза Пашкевіч. Яна вельмі турбавалася за выданне, таму часта непакоіла друкарню падобнымі лістамі:

"Я хачу даведацца ад Вас, што чутно з букваром, ці ўжо гатоў, ці ў нас будзе фанэтыка наша беларуская. Гэта вельмі важна, бо буду цяпер выдаваць папулярныя рэчы для народу, дык не ведаю, як чаго трымацца".

Калі буквар пабачыў свет, наконт яго было шмат розных думак. На жаль, на той час яшчэ не існавала афіцыйных беларускіх школ і гімназій. Кнігу выкарыстоўвалі ў хатняй адукацыі. Галоўная мэта буквара была ў тым, каб сфармаваць беларускі правапіс. Раней у кожным рэгіёне пісалі па-свойму, у залежнасці ад асаблівасцей мясцовай гаворкі.

КРОК №5

Праз пэўны час Пашкевіч вярнулася ў Вільню. Там актыўна пачала выступаць з прамовамі і друкаваць вершы. І вось у такі перыяд народ пачаў яе ўспрымаць пад псеўданімам Цётка. Па сённяшні час невядома дакладна прычына яго ўзяцця, але існуюць дзве версіі. Першая: аднойчы Алаіза выступала на мерапрымстве. І слухачам спадабалася яе прамова, таму пачалі казаць: "Ну і кажа цётка!". Другая: блізасць да народа. У беларускай мове словы "цётка", "дзядзька"

або “бацька” – не столькі апісанне статуса, колькі зварот да чалавека. Нешта падобнае ў рускай мове кажуць пры звяртанні «женщина», «мужчина» або «девушка». Пашкевіч разумела, што імя і прозвішча людзі могуць не запомніць. Лепш узяць псеўданім, які будзе блізкі народу.

Імідж складаецца з вялікай колькасці фактараў. Алаіза не толькі ўзяла псеўданім, але і змяніла сваю манеру размаўляць. Яна расла ў той атмасферы, дзе да людзей звярталіся на вы. Каб зблізіцца з бяднейшымі, пачала да ўсіх – незалежна ад статуса – звяртацца на ты. Некаторым інтэлігентам у яе выкананні гэта падавалася “наігранным”.

КРОК №6

Цётка актыўна займалася прасоўваннем беларускай культуры. Мала хто ведае, што ў яе была мроя. Жанчына з дзіцячых гадоў хацела стаць прафесійнай акторкай. На жаль, у сям’і не хапала грошай на вучобу. У дарослым узросце Алаіза вырашыла ажыццявіць мрою. Адвучылася на масажыстку. Пасля пачала гэтым зарабляць. Усе атрыманыя рублі ўкладала ў курсы акторскага майстэрства. Ці стала ў канцы акторкай? Так, прымала ўдзел у спектаклях трупы Ігната Буйніцкага. Калі што, ён з’яўляецца бацькам беларускага прафесійнага тэатра.

КРОК №7

Цётка прайшла Першую Сусветную вайну. Хоць не была на палях баёў, але працавала сястрой міласэрнасці ў шпіталях. Аднойчы прывезлі Максіма Гарэцкага – беларускага пісьменніка. Ён быў паранены. Спачатку яго часта наведвала сям'я. Потым сваякі менш прыходзілі, бо не маглі зразумець што з ім адбываецца. Як высветлілася, пасля ранення здарылася ў творцы дэпрэсія. Ён быў ужо ў той стадыі, што мог накласці на сябе рукі. Алаіза прыйшла яго ратаваць. Хоць Гарэцкі не хацеў размаўляць, яна знайшла падыход і выцягнула з таго свету.

КРОК №8

Цётка мела мужа. Ім быў літоўскі палітык – Сцяпонас Кайрыс. Як узгадвалі сведкі, іх шлюб быў фіктыўным. Нават ёсць доказы. Напрыклад, жылі яны ў розных крылах будынка. У кожнага быў свой пакой. Калі да яе прыходзілі госці, прымала і частавала толькі ў сваіх “чатырох сценках”. З мужам не выходзіла ў свет, рэдка каго з ім знаёміла. Пад канец жыцця аднаму сябру Алаіза сказала, што хацела хоць бы раз спазнаць сапраўднае каханне. Жывучы ў чаканні моцнага пачуцця, зычыла ўсім знайсці пару. Знайшоўшы – ніколі не адпускаць, бо толькі каханне можа акрыліць і даць моц рухацца да шчасця.

Дарэчы, цікавы факт. Калі жанчына памерла, яе пахавалі ў белай вопратцы. На той момант светлы колер быў сімвалам незамужняй і цнатлівай дзяўчыны. Хоць, паўтаруся, – была замужняй кабетай. На яе пахаванне прыехаў Кайрыс, што выклікала здзіўленне ў людзей. Можа, ён кахаў яе больш, чым яна яго?

КРОК №9

Цётка заўсёды мела вялікую павагу з боку людзей. На пачатку 1900-х гадоў было спецыфічнае стаўленне да жанчын. Але наша дзяячка змагла зрабіць так, што мужчыны лічылі яе роўнай сабе. Пры ёй нават баяліся падымаць кубкі з алкагольным напоем. Толькі калі выйшаў з друку першы нумар газеты “Наша доля”, дазволіла ім выпіць у сваёй кампаніі. Як кажуць, была выключна адна чарка гарэлкі.

Сяляне да нашай беларускі прыходзілі, як да сяброўкі. Аднойчы Цётка прыехала да бацькі ў маёнтак. Убачыла, што ў сялянскіх дзяўчынак валасы не сабраны. Ёй захацелася дзяцей упрыгожыць, таму ўзяла рознакаляровы падол сваёй сукенкі і парэзала на стужкі. Пасля іх запляла дзецям у валасы.

Часта Алаіза размаўляла з сялянамі, якія працавалі на яе бацьку. Яны ёй скардзіліся, што працы дае шмат, а грошай атрымліваюць мала. На гэта ім ка-





зала, каб ішлі да яго і прасілі паляпшэння ўмоў і павышэння заробкаў. Як вы зразумелі, Цётка была заўсёды на баку бяднейшых і слабейшых людзей.

КРОК №10

1916 год стаў трагічным у жыцці жанчыны. Спачатку смерць бацькі. Трэба сказаць, у Алаізы заўсёды былі праблемы са здароўем, але яна маўчала. Не любіла шкадаванняў у свой бок. Пахаваўшы бацьку, даведалася пра эпідэмію тыфу на Шчучыншчыне. Вырашыла застацца і дапамагчы каму вылечыцца, а каму адысці на той свет. Выбраўшы людзей, прыгаварыла сябе да смерці: праз слабы імунітэт злавіла тыф. Усе верылі, што яна не здасца хваробе. Калі спадзяванні не апраўдаліся, знаёмыя выклікалі Сцяпонаса Кайрыса, каб муж і жонка развіталіся. На жаль, не змаглі – не прыйшла ў сябе. Памерла.

КРОК №11

Алаізу Пашкевіч турбаваў лёс беларускіх жанчын. Заўсёды пакутвала, калі яны не маглі атрымаць адукацыю. Звярталася да іх з прамовамі, каб ішлі вучыцца. Станавіліся лепшымі версіямі сябе. Казала, што толькі адукаваная жанчына можа выхаваць патрыётаў сваёй краіны. Яна не любіла кідацца словамі. Так, у 1912 годзе адкрыла першую беларускую жаночую арганізацыю “Беларускі жаноцкі гурток”. На жаль, пасля смерці стваральніцы ён спыніў сваю дзейнасць.

У 1930-я гады ў Заходняй Беларусі ў гонар Алаізы Пашкевіч запрацавала арганізацыя “Аб’яднанне беларускіх жанчын імя Цёткі”. Якраз у 1931 годзе пры аб’яднанні пачаў выходзіць часопіс “Жаноцкая справа”. Каб яго разрэкламаваць, быў выпушчаны артыкул “Прабуджэнне Беларускі”.

КРОК №12

Як выглядала Алаіза Пашкевіч? У Інтэрнэце можна знайсці шмат фотаздымкаў дзяячкі. На некаторых ў поўны рост, а на іншых – на палову. Не так даўно даследчыкі высветлілі, што не на ўсіх фота зафіксавана Цётка. Гэта падобныя кабеты, якіх памылкова выдаюць за яе. Калі прыгледзецца, можна заўважыць, што не супадае стыль вопраткі з часам жыцця гераіні. Таксама адрозніваюцца рысы твараў. Вось для параўнання: Цётка – злева, псеўдаЦётка – справа. Бачыце розніцу?



Алаіза Пашкевіч пражыла 40 гадоў. Многа ці мала – невядома. Але аддаўшы сябе поўнасцю беларускай справе, стала роднай ЦЁТКАЙ. І працягвае быць ёй у XXI-м стагоддзі. ■